16 гадоў. Тым не менш большая частка дзяцей засталася на акупіраванай тэрыторыі Беларусі і разам з дарослымі пераносіла ўсе цяжкасці ваеннага часу.

У перыяд баявых аперацый па захопе Беларусі была ліквідавана савецкая сістэма адукацыі, мела месца масавае знішчэнне дзяцей, настаўнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі, разбураліся школьныя будынкі і іншыя навучальныя ўстановы, рабавалася іх матэрыяльная база.

У чэрвені—жніўні 1941 г. на акупіраванай тэрыторыі Беларусі гаспадарылі германскія часовыя вайсковыя ўлады, якія не займаліся пытаннямі арганізацыі адукацыйнай сістэмы і не мелі наконт гэтага ніякіх установак з цэнтра. Іх дзейнасць абмяжоўвалася ў асноўным вырашэннем ваенна-эканамічных задач, правядзеннем падрыхтоўча-арганізацыйных мерапрыемстваў па стварэнні належных умоў функцыяніравання германскіх акупацыйных органаў улады. Тым не менш, нягледзячы на адсутнасць загадаў у адукацыйнай сферы, ваеннае кіраўніцтва не забараняла мясцовым уладам распачынаць школьную справу.

Ужо ў пачатку дзейнасці германскай грамадзянскай улады на захопленай тэрыторыі Беларусі былі праведзены мерапрыемствы па наладжванні акупацыйнай сістэмы адукацыі, стварэнні яе органаў кіравання. Улады нацысцкай Германіі бачылі ў школьнай сістэме інстытут, які павінен быў пазбавіць падрастаючае пакаленне Беларусі ўплыву камуністычнай ідэалогіі і выхаваць яго ў духу нацыянал-сацыялізму, уцягнуць беларускую моладзь у сферу германскіх ваенна-эканамічных інтарэсаў і тым самым стварыць перадумовы для экспарту ідэй нацыянал-сацыялізму. Маладое пакаленне павінна было стаць апорай у далейшай рэалізацыі экспансіўнай акупацыйнай палітыкі Германіі на ўсходніх тэрыторыях.

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі была створана сетка курсаў і навучальных устаноў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў. Новая генерацыя педагогаў заклікалася не толькі да авалодання спецыяльнымі ведамі, але ў першую чаргу да засваення ідэй нацыянал-сацыялізму, сродкаў і метаду яго ўкаранення ў навучальна-выхаваўчы працэс.

Пры падтрымцы калабарацыяніцкіх колаў германскія акупацыйныя ўлады наладзілі працу сеткі школьных пачатковых, сярэдніх і спецыяльных устаноў. Іх колькасць абмяжоўвалася развіццём ваенна-палітычнай сітуацыі на савецка-германскім фронце і акупіраванай тэрыторыі Беларусі, асабліва ўплывам дзейнасці партызан і падпольшчыкаў супраць германскіх агрэсараў.

Навучальна-выхаваўчы працэс меў адметную нацыянальна-прапагандысцкую афарбоўку і нацысцкую сутнасць, быў накіраваны на падрыхтоўку неабходных ваенна-эканамічных кадраў дзеля паспяховай рэалізацыі палітыкі Германіі на ўсходзе.

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі разгарнулася вострая ідэалагічная барацьба за падрастаючае пакаленне. Падпольныя партыйныя і камсамольскія органы прыкладвалі ўсе намаганні па зрыве германскай адукацыйнай палітыкі. У партызанскіх зонах былі арганізаваны і дзейнічалі школы, у якіх навучанне вялося па савецкіх праграмах, выхаваўчы працэс будаваўся на камуністычных ідэях, нянавісці да германскіх акупантаў, адданасці Радзіме.

Мэтанакіраваная дзейнасць партызан і падпольнчыкаў садзейнічала зрыву германскай адукацыйнай палітыкі. Большая частка падрастаючага пакалення Беларусі не прыняла нацысцкую ідэалогію і актыўна ўдзельнічала ў патрыятычным супраціўленні германскім агрэсарам.

У межах навуковай распрацоўкі праблемы важнае месца займаюць пытанні дзейнасці партызан і падпольшчыкаў па пошуку і выпрацоўцы зместу, форм і метадаў арганізацыі навучальна-выхаваўчай працы ва ўмовах акупацыі. Перад падпольнымі партыйнымі, камсамольскімі органамі і арганізацыямі, партызанамі, настаўнікамі і ўсім сталым насельніцтвам стаялі выключна складаныя задачы не толькі па захаванні жыцця дзяцей, але і па наладжванні працэсу іх навучання з мэтай выхавання сапраўдных патрыётаў сваёй Радзімы.

Справа выхавання беларускай моладзі на патрыятычных прыкладах мінулага з'яўляецца вельмі актуальнай. Сёння назіраецца спроба падмены жыццёвых каштоўнасцей і ідэалаў. Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны — не толькі багацейшая скарбонка гераічнага летапісу барацьбы беларускага народа супраць германскіх агрэсараў, але і цікавая старонка з пункту гледжання вопыту вырашэння адукацыйна-выхаваўчых пытанняў у найскладанейшых умовах гістарычнага мінулага нашай Бацькаўшчыны.

**А. П. Жытко**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка, г. Мінск*

## ПРАБЛЕМЫ АПЕРЫРАВАННЯ НЕКАТОРЫМІ НАВУКОВЫМІ КАТЭГОРЫЯМІ Ў ГІСТАРЫЧНЫМ ПАЗНАННІ

Сучасны стан гістарычнай навукі ў Беларусі абагулена можна ахарактарызаваць так: па *форме* навуковыя артыкулы і манаграфіі выконваюцца пад сцягам найноўшых дасягненняў метадалогіі гістарычнай навукі, а *змесце* і па сваёй сутнасці яны па-ранейшаму грунтуюцца на пастулатах марксісцкай метадалогіі. У гістарыяграфіі, за выключэннем крайне рэдкіх прац, ацэнкі ключавых гістарычных падзей, перыядызацыя гістарычных працэсаў і складаных фактаў гістарычнай рэчаіснасці падаюцца як аксіёмы,

якія без усякай навуковай крытыкі перакачавалі ў постсавецкую беларускую гістарыяграфію. А гэта значыць, што, нягледзечы на заяўкі аўтараў, абсалютная большасць прац па сваёй сутнасці знаходзіцца ў кайданах былой ідэалогіі. Адзінае станоўчае ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі — гэта адказ ад класічнага вульгарызму, навешвання ярлыкоў, за рэдкім выключэннем.

На нашу думку, адной з прычын такой сітуацыі з'яўляецца тое, што большасць навукоўцаў ці ўвогуле не валодаюць асновамі сучасных метадалагічных канцэпцый, ці няздольныя прымяняць на практыцы навуковы катэгарыяльны апарат.

Другая прычына крыецца ў тым, што значная частка даследчыкаў не валодае метадамі навуковай крытыкі інфармацыі крыніц ці наўмысна альбо ненаўмысна механічна пераносіць факты гістарычных крыніц у свае працы, выдаючы іх за простыя факты гістарычнай рэчаіснасці, якія па сваёй прыродзе з'яўляюцца аб'ектыўнымі.

У гістарычнай навуцы да сённяшняга часу захаваўся шэраг стэрэатыпаў, на навуковасць якіх даследчыкі не звяртаюць увагі. Мы прыпынімся толькі на некаторых з іх, каб паказаць, наколькі небяспечна ўжываць тыя ці іншыя паняцці, звязаныя са складанымі фактамі гістарычнай рэчаіснасці. Як вядома, складаныя факты звычайна маюць часавую і прасторавую працягласць. Таму для навукоўца ўзнікае праблема выяўлення часу пачатку і завяршэння дзеяння складанага факта, а таксама яго прасторавага распаўсюджвання. У сувязі з гэтым складаны факт гістарычнай рэчаіснасці, у адрозненне ад простага, характарызуецца наяўнасцю сутнасных рыс, якія вызначаюць у сваёй сукупнасці яго змест. Але ў гістарычным працэсе сутнасныя характарыстыкі ўступаюць у дзеянне звычайна не адначасова, а ў розных храналагічных рамках. У сувязі з гэтым катэгорыя «складаны факт гістарычнай рэчаіснасці» цесна звязана з такімі катэгорыямі, як «гістарычны час і гістарычная прастора». Адсюль узнікаюць праблемы пры разглядзе канкрэтнага гістарычнага матэрыялу. Складаны ж факт гістарычнай рэчаіснасці мае месца і рэальна існуе толькі ў тых выпадках, калі даследчык заўважыць час уступлення ў дзеянне *ўсіх* сутнасных рыс, а не адной ці толькі часткі з іх. Таму ў даследаванні тыя з першых рыс, якія характарызуюць складаны факт, будуць у гісторыі толькі передумовай падзей, а не самой вывучаемай падзеяй, альбо пачаткам гістарычнага часу. І наадварот, калі хоць адна з характэрных сутнасных рыс складанага факта перастае існаваць, то можна гаварыць і аб часавай завершанасці складанага факта. Усё іншае ў гісторыі называецца вынікамі, наступствамі і гэтак далей. Абсалютызацыя адной з сутнасных рыс вядзе да няправільных трактовак гістарычнага працэсу.

Для таго каб зразумець сутнасць шматлікіх гістарычных працэсаў, даць ім навуковую ацэнку, звернемся да некаторых праблем гісторыі Беларусі перыяду капіталізму.

Ва ўсіх даследаваннях, у тым ліку, на жаль, і ў падручніках, сцвярджаецца, што прамысловы пераварот у Беларусі пачаўся з сярэдзіны 20-х гадоў XIX ст. і, у прыватнасці, з пуску ў дзеянне ў 1823 г. паравога рухавіка на Хомскай фабрыцы (Кобрынскі павет) дваранiна В. Пуслоўскага. Даследчыкі пры гэтым указваюць, што на фабрыцы, акрамя паравога рухавіка, меліся вадзяны і конскі рухавікі [1, с. 123]. Але пры гэтым не ўказваецца, якая роля ў працы 44 ткацкіх станаў прыпадала на паравы рухавік. Звычайна даследчыкі пры разглядзе складаных фактаў гістарычнай рэчаіснасці блытаюць катэгорыі «гістарычны час» і «перыядызацыя» (пачатак факта і час яго завяршэння). Нагадаем, што гістарычны час звычайна складаецца з некалькіх сутнасных узроўняў, якія храналагічна ўступаюць у дзеянне неадначасова. Таму працягласць гістарычнага часу адлічваюць ад пачатку дзеяння першай сутнаснай рысы і ён заканчваецца пасля завяршэння апошняй з іх. Сам факт з'яўлення паравога рухавіка не выклікае пярэчанняў. А вось сцвярджэнне, што з яго паяўленнем пачаўся прамысловы пераварот у Беларусі, вельмі праблематычна. З метадалагічнага пункту погляду даследчык павінен дакладна ведаць, што ўкладваецца ў паняцце такога складанага факта, як прамысловы пераварот. Сутнаснымі рысамі прамысловага перавароту выступаюць тры складовыя: наяўнасць машыннай працы, вольнай, прафесійнай рабочай сілы і прамысловай буржуазіі. У сувязі з гэтым застаюцца адкрытымі пытанні — хто складаў касцяк рабочай сілы на ткацкай фабрыцы В. Пуслоўскага. Калі яго прыгонныя (а сам ён з'яўляўся дваранінам-памешчыкам), то аб якім пачатку прамысловага перавароту можа ісці гаворка?

На самай справе, яшчэ да скасавання прыгону ў Беларусі даволі шпарка пачала прымяняцца машынная праца і, звычайна, на прадпрыемствах, заснаваных дваранамі-памешчыкамі. Але гэта не сведчанне таго, што прамысловы пераварот пачаўся з сярэдзіны 20-х гадоў XIX ст. Без наяўнасці свабоднай, прафесійнай рабочай сілы гаварыць аб ім не прыходзіцца. З'яўленне паравога рухавіка — гэта толькі перадумова прамысловага перавароту, а не сам пераварот. Аб ім можна гаварыць толькі пасля правядзення ў жыццё рэформы 1861 г. Праўда, у Беларусі, у параўнанні з унутрырасійскімі рэгіёнамі, яшчэ да рэформы 1861 г. меліся катэгорыі незапрыгоненых людзей (не даказаўшая сваё паходжанне шляхта, вольныя людзі, вольныя хлебаробы, чыншавікі, аднадворцы і г. д.), якія патэнцыяльна маглі складаць атрад рабочых на фабрыках і заводах. Аднак у беларускай гістарыяграфіі практычна не праводзіліся даследаванні па праблеме крыніц папаўнення рабочага класа ў дарэформенны перыяд.

Што тычыцца пытання, калі ж завяршыўся прамысловы пераварот, то можна адказаць наступным чынам. У асноўным час заканчэння вызначаецца тым перыядам, калі фабрычна-заводская вытворчасць пераўзышла вытворчасць прамысловай прадукцыі рамеснай, дробнатаварнай, простай капіталістычнай кааперацыі і мануфактурнай, узятых разам.

У савецкай і постсавецкай гістарыяграфіі ўкараніўся тэзіс і пра тое, што буйное дваранскае землеўладанне з'яўлялася перажыткам феадальнай эпохі, што яно разам з сялянскім дробназямельным уладаннем з'яўлялася прычынай першай, а потым і наступных рэвалюцый. Разам з тым, на наш погляд, нельга так адназначна падыходзіць да азначанай праблемы. Калі б навукоўцы задаліся пытаннямі: «Чаму ў Беларусі найбольш узорныя, перадавыя гаспадаркі належалі памешчыкам-латыфундыстам? Чаму найбольш вядомыя фабрыкі і заводы былі пабудаваны ў іх памесцях? Чаму ў савецкі час на базе гэтых маёнткаў утвараліся першыя камуны і калгасы?», то, відавочна, адказы насілі б іншы характар. Для вядзення таварнай гаспадаркі і яе пашыранага ўзнаўлення неабходна была вялікая колькасць зямлі. Улічваючы, што зямля давала толькі сезонны прыбытак, і тое, што для ўвядзення капіталістычнай сістэмы ў земляробстве патрэбны былі значныя грашовыя сродкі, то толькі латыфундысты маглі мадэрнізаваць сельскагаспадарчую вытворчасць. Для дробна- і сярэднезямельных памешчыкаў, а тым больш для сялян, гэта праблема ў Беларусі была практычна невырашальнай. Калі ва ўнутрырасійскіх губернях памешчыкі атрымлівалі сродкі праз Дваранскі пазямельны банк і іншыя, звычайна камерцыйныя, установы, то пазямельныя дваране Беларусі, якія ў асноўным былі католікамі, крэдытамі Дваранскага банка не маглі карыстацца. Праўда, з 1872 г. распачаў сваю дзейнасць Віленскі камерцыйны пазямельны банк, аднак задаволіць попыт на крэдыты ўсіх жадаючых ён быў не ў стане. Гэта была адна з прычын, чаму менавіта ў Беларусі буйное землеўладанне першым адгукнулася на запыты часу, з'яўлялася носьбітам прагрэсу ў сельскай гаспадарцы [2, с. 96—202, 230—233; 3, с. 3—5].

Акрамя гэтага, неабходна ўлічваць і тое, што пад агульнай трактоўкай дваранскае землеўладанне ў марксісцка-ленінскай метадалагічнай трактоўцы яно выступала пад псеўданімамі: прыгонніцкае, перажытак прыгону, тормаз прагрэсу, прычына сялянскага малазямелля і г. д.

У буржуазны перыяд, калі значная частка дваран-памешчыкаў перавяла свае гаспадаркі на капіталістычныя рэйкі, яны толькі па сваёй форме заставаліся дваранамі, а па сутнасці, змесце — прадпрымальнікамі буржуазнага тыпу. Калі ж улічыць, што большасць паместнага дваранства Беларусі была прадстаўлена католікамі, якія з 1863 г. падвяргаліся палітычнай і эканамічнай дыскрымінацыі, страцілі прывілеі вышэйшага саслоўя, то аб якіх перажытках феадалізму можа ісці гаворка?

Акрамя гэтага, у беларускіх губернях чвэрць дваран (якіх па ленінскай класіфікацыі неабходна аднесці да беднаты) мела зямлі менш за 10 дзесяцін.

Што ж тычыцца перыядызацыі, то адпаведна ленінскай канцэпцыі ў савецкай гістарыяграфіі абсалютызаваўся партыйна-класавы падыход. У прыватнасці, Першая расійская рэвалюцыя падзялялася на пяць этапаў яе развіцця з указаннем дакладных дат: 1) пачатак рэвалюцыі — з 9 студзеня па красавік 1905 г.; 2) развіццё рэвалюцыі ўшырыню — з мая па верасень таго ж года; 3) вышэйшы пад'ём рэвалюцыі — з кастрычніка па снежань 1905 г.; 4) спад рэвалюцыі, аслабленне яе націску — са студзеня па жнівень 1906 г., 5) адступленне рэвалюцыі — са жніўня 1906 г. па 3 чэрвеня 1907 г. [4, с. 121].

Мы паспрабуем выявіць не ўнутраную перыядызацыю рэвалюцыі, а час яе пачатку і завяршэння. Пры перыядызацыі рэвалюцыі, як і ўсякага іншага складанага факта гістарычнай рэчаіснасці, нельга таксама абсалютызаваць той ці іншы фактар. У бальшавікоў гэта этапы класавай барацьбы ў асноўным рабочага класа пад кіраўніцтвам РСДРП, што і было ўзята за галоўны і адзіны крытэрый перыядызацыі. Але ж усякая рэвалюцыя — гэта супрацьстаянне ўсіх апазіцыйных сіл, з аднаго боку, і сіл, якія адстойвалі існуючы палітычны лад, — з другога. Таму, калі мы спрабуем вызначыць пачатак і завяршэнне рэвалюцыі, спачатку неабходна ўстанавіць сутнасныя рысы, якія якасна характарызуюць паняцце «рэвалюцыя». На нашу думку, усякая рэвалюцыя ўяўляе з сябе: 1) адкрытае, 2) масавае выступленне 3) за ліквідацыю ці карэнную змену існуючага палітычнага ладу. Пачатак дзеяння адной ці дзвюх з указаных рыс — гэта яшчэ не азначае пачатку рэвалюцыі. Толькі пры ўмове, калі даследчык у тых ці іншых канкрэтных падзеях выявіць уступленне ў дзеянне ўсіх трох рыс у сукупнасці, толькі тады можна меркаваць аб пачатку рэвалюцыі. І наадварот, калі адна з гэтых рыс перастане дзейнічаць, то можна канстатаваць, што рэвалюцыя закончылася. Указаныя якасці і адрозніваюць рэвалюцыю ад такіх паняццяў, як бунт, загавор і інш.

Па ініцыятыве «Саюза вызвалення» з 20 лістапада 1904 г. пачалося правядзенне банкетных кампаній, прысвечаных 40-годдзю з дня прыняцця Судовых статутаў. На банкетах збіраліся прадстаўнікі аднародных прафесій (адвакаты, прафесура, журналісты, урачы і г. д.). Пад час правядзення гэтай кампаніі лібералы адкрыта патрабавалі прыняцця канстытуцыі, стварэння ўсенародна абранага законатворчага прадстаўнічага органа, абвяшчэння палітычных свабод і ўсіх іншых атрыбутаў прававой дзяржавы. Гэтыя патрабаванні падпісваліся прысутнымі на банкетах і друкаваліся не толькі ў часопісе «Вызваленне», але і ў дзвюх легальных газетах, заснаваных у пачатку лістапада 1904 г. Нават савецкая гістарыяграфія вымушана была прызнаць, што асобныя ліберальныя сходы пераўтвараліся ў адкрытыя народныя мітынгі і нават у вулічныя дэманстрацыі. У выніку ў 34 гарадах адбылося звыш 120 ліберальных сходаў з колькасцю ўдзельнікаў каля 50 тыс. чалавек. Гэта была грандыёзная, адкрытая палітычная акцыя, якая актывізавала і рабочы, і сялянскі рух, вымусіла ўрад рабіць хоць і кволыя, але паступова прагрэсіруючыя крокі па рэфармiраванні палітычнай сістэмы.

Як бачым, выступленні лібералаў з 20 лістапада 1904 г. насілі адкрыты, масавы характар з патрабаваннямі ліквідацыі абсалютнай манархіі і ўтварэння прававой, дэмакратычнай дзяржавы. Таму ёсць усе навуковыя падставы лічыць, што першая рэвалюцыя пачалася не 9 студзеня 1905 г., а 20 лістапада 1904 г.

Што тычыцца падзей 9 студзеня 1905 г., то з імі вельмі цяжка звязаць пачатак першай рэвалюцыі ў Расіі. Так, на самай справе гэта было адкрытае і масавае выступленне, але не супраць самадзяржаўя, не супраць існуючай палітычнай сістэмы. Не патрабаванні, а хутчэй просьбы насілі эканамічны характар і іх вырашэнне звязвалі з воляй бацюшкі-цара. Іншая справа, што расстрэлы ў крывавую нядзелю ўскалыхнулі ўсю Расію, радыкалізавалі рух усіх апазіцыйных царызму сіл.

Кульмінацыйны перыяд рэвалюцыі прыпадае на час кастрычніцкай усерасійскай палітычнай стачкі. Гэта было самае масавае, адкрытае выступленне ўсіх апазіцыйных сіл за змену існуючага палітычнага ладу, вынікам якога стаў Маніфест 17 кастрычніка 1905 г.

Вельмі важным уяўляецца пытанне: першая расійская рэвалюцыя закончылася паражэннем ці перамогай і калі? Адказ на гэта пытанне з метадалагічнага пункту гледжання вельмі неадназначны. Каб больш-менш навукова падвесці вынікі рэвалюцыі, неабходна звярнуцца зноў да сутнасных рыс рэвалюцыі, якія адзначаліся вышэй.

Адкрытыя масавыя выступленні рабочага класа практычна закончыліся святкаваннем 1 мая 1907 г., дзе пераважалі эканамічныя, а не палітычныя патрабаванні. Сялян з канца 1906 г. больш хвалявалі аграрная рэформа і скасаванне выплаты выкупных плацяжоў. Салдацкі і матроскі рух пасля ліпеньскіх падзей 1906 г. рэзка пайшоў на спад. Ліберальны рух, хоць і меў у асноўным палітычную афарбоўку, быў адзначаны толькі пад час выбарчых кампаній у Дзяржаўную думу I і II скліканняў з мэтай мадэрнізацыі палітычнай сістэмы. Сацыял-дэмакраты на V з'ездзе РСДРП знялі лозунг узброенага паўстання як асноўнага сродку дасягнення сваёй мэты.

Як бачым, па дзеянні гэтых сутнасных рыс для розных сацыяльных і палітычных сіл рэвалюцыя завяршылася ў розны гістарычны час. Трэцяга чэрвеня 1907 г. царызм зрабіў юрыдычныя захады па абмежаванні палітычных заваёў рэвалюцыі. У сувязі з гэтым ніякага дзяржаўнага перавароту не адбылося, паколькі новая палітычная сістэма, усхваляваная Маніфестам 17 кастрычніка, па сваім унутраным змесце захавалася.

Такім чынам, рэвалюцыя закончылася значна раней трэцячэрвеньскіх падзей 1907 г. Са зменай выбарчага закону па-сутнасці пагадзіліся ўсе сацыяльна-палітычныя сілы. У адказ на дзеянні ўрада не адбылося ніводнага масавага пратэсту, як тое было пасля разгону I Думы.

Заканчэнне рэвалюцыі зусім не азначае яе паражэння, як лічылі прадстаўнікі партый сацыялістычнай арыентацыі (бальшавікі). Галоўная задача ўсякай рэвалюцыі — гэта барацьба за замену палітычнай сістэмы. Характар гэтых змен, глыбіня, сродкі дасягнення рознымі палітычнымі сіламі ўяўляліся рознымі. Так, калі разглядаць мэты асноўных апазіцыйных палітычных партый, то праблема ўлады для акцябрыстаў была вырашана выданнем Маніфеста 17 кастрычніка. Для кадэтаў этап фізічнага насілля ў рэвалюцыі скончыўся адкрыццём работы Дзяржаўнай думы I склікання. Цяпер кадэты спадзяваліся, што далейшае рэфарміраванне палітычнай сістэмы будзе адбывацца праз думскую дзейнасць. Таму перамога для іх была палавінчатай. Для розных партый сацыялістычнай арыентацыі, якія планавалі дасягнуць галоўных палітычных мэт праз тэрор і ўзброенныя выступленні, рэвалюцыя пацярпела паражэнне.

Што тычыцца рабочага класа і сялянства, іх удзел у рэвалюцыі ў параўнанні з інтэлігенцыяй абумоўліваўся мэтамі эканамічнага характару. Зыходзячы з гэтага, іх памкненні былі часткова задаволены. Так, рабочы клас дабіўся скарачэння рабочага дня, павышэння заборку, увядзення калектыўных дагавораў, сацыяльнага страхавання і г. д. Селянін з паўперсоны станавіўся паўнапраўным грамадзянінам нараўне з іншымі сацыяльнымі групамі, атрымаў магчымасць набыцця зямлі ў асабістую прыватную ўласнасць. Усё гэта заваёвы рэвалюцыі, а не яе паражэнне.

У ходзе рэвалюцыі былі пастаўлены шматлікія нацыянальныя пытанні. Самае радыкальнае з іх — права нацый на самавызначэнне і ўтварэнне незалежных дзяржаў — не здзейснілася. Але і ў гэтай галіне былі пэўныя заваёвы. У некаторых нацыянальных рэгіёнах пачало дазваляцца выкладанне ў школах на роднай мове, пачаў функцыяніраваць нацыянальны друк і г. д.

У бальшавіцкай, а затым і савецкай гістарыяграфіі даказвалася, што рэвалюцыя пацярпела паражэнне, аднак прызнаваліся і некаторыя яе заваёвы. Адзначалася, што Першая расійская рэвалюцыя з'явілася генеральнай рэпетыцыяй кастрычніцкіх падзей 1917 г. Яна ўзбагаціла тэорыю і практыку рэвалюцыйнай барацьбы, а бальшавікі набылі вопыт стварэння органаў дзяржаўнага кіравання ў форме Саветаў і інш.

Такім чынам, сцвярджаць, што першая рэвалюцыя пацярпела паражэнне, а тым больш 3 чэрвеня 1907 г., няма навуковых падстаў. У той жа час лічыць, што яна перамагла — таксама не прыходзіцца.

Што тычыцца аперыравання навукоўцамі фактамі гістарычных крыніц (адлюстроўванне фактаў гістарычнай рэчаіснасці аўтарам крыніцы), якія ў большасці суб'ектыўныя па сваёй прыродзе, то і тут ёсць шэраг праблем. У якасці прыкладу звернемся да пытання аб узроўні развіцця малочнай вытворчасці ў Беларусі перыяду капіталізму, а гэта значыць і да адной з праблем капіталізацыі сельскай гаспадаркі.

Вядома, што 80—90-я гады XIX ст. з'явіліся пераломнымі ў перыярыентацыі дваранска-памешчыцкай гаспадаркі з чыста збожжавай на жывёлагадоўчую. У апошняй адметную ролю адыгрывала малочнатаварная вытворчасць, якая на пачатку XX ст. атрымоўвала ўсё больш рынкавы характар. Разам з тым нельга пагадзіцца з шэрагам беларускіх даследчыкаў, якія абсалютызуюць ролю малочнай вытворчасці ў краі. Як уяўляецца, зыходзячы з гістарыяграфічнага аналізу, першым, хто перабольшыў поспехі памешчыцкай малочнатаварнай вытворчасці, з'яўляецца Х. Ю. Бейлькін. У прыватнасці, у сваёй манаграфіі

і шэрагу артыкулаў ён пераводзіць абстрактна-тэарэтычныя магчымасці дойнага статку Беларусі ў абсалют [5]. Х. Ю. Бейлькін указвае, што ў 1861—1865 гг. у пяці заходніх губернях сярэднягадовая вытворчасць склала 111, у 1866—1870 гг. — 113, 1876—1880 гг. — 134 тыс. пудоў масла. У канцы XIX ст. агульная таварная прадукцыя склала 500—650 тыс. пудоў масла і сыру [5, с. 72, 140]. У той жа час вядома, што для атрымання аднаго пуда масла неабходна было перапрацаваць 121 вядро малака. Скажам, у 1870 г. у пяці заходніх губернях налічвалася 594,2 тыс. дойных кароў. Каб атрымаць у 60—70-х гадах у сярэднім 111 тыс. пудоў масла, неабходна было ўсё малако перапрацаваць у гэты прадукт: 594,2 тыс. кароў давалі ў сярэднім у год па 22,6 вядра малака. Яны маглі даць 13428,9 тыс. вёдзер малака. Калі гэту суму падзяліць на 121, то атрымаем 111 тыс. пудоў масла. Такім чынам, гэта толькі тэарэтычная магчымасць. Разам з тым усе крыніцы ўказваюць на тое, што на выраб масла і цвёрдых сыроў ішло малако выключна памешчыцкіх кароў [6, с. 88], надоі якіх у той час ваганіся ад 23 да 60 вёдзер у год, і толькі вельмі ў рэдкіх маёнтках малака атрымлівалі больш. Значыць, 163,4 тыс. кароў прыватнікаў маглі даць 3,8—9,8 млн вёдзер малака ў год, з якога (калі ўсё перапрацоўвалі толькі на масла) маглі атрымаць ад 30 да 80 тыс. пудоў масла, альбо ў сярэднім 55 тыс. пудоў. Разам з тым малако спажывалася як непасрэдна, так і ў выглядзе вяршкоў, смятаны, тварагу і сыру. Толькі для атрымання 1 пуда галандскага сыру неабходна было перапрацаваць 10,6—10,7 вёдзер малака [7, с. 807]. Таму лічбы, якія прыводзяцца Х. Ю. Бейлькіным аб вытворчасці масла і іншых малочных прадуктаў, можна смела знізіць як мінімум у 2—3 разы. А між тым яго статыстычныя падлікі некрытычна перакачавалі ў іншыя манаграфіі і падручнікі па гісторыі Беларусі перыяду капіталізму.

Такім чынам, няздольнасць Х. Ю. Бейлькіна, як і іншых даследчыкаў, праводзіць унутраную крытыку інфармацыі крыніц ці наўмысная падгонка фактаў гістарычнай крыніцы для доказу той ці іншай канцэпцыі прыводзяць да суб'ектывізму, ненавуковасці даследванняў.

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.). — Мінск: Экаперспектыва, 2005. — 4 т.
2. *Жытко А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму 1861—1914 гг. / А. П. Жытко. — Мінск: БДПУ. 2003.
3. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму: у 5 ч. / гал. рэд. А. П. Жытко. — Мінск: БДПУ. 2005. — 1 ч.
4. Исторический опыт трех российских революций: в 3 кн. — М.: Политиздат, 1985. — 1 кн.
5. *Бейлькин Х. Ю.* Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1801—1914 гг. / Х. Ю. Бейлькин. — Минск: Наука и техника, 1989.
6. Несколько сведений о современном состоянии сельского хозяйства и промыслов в Гродненской губерии. — Гродно: Гродненский стат. ком.. 1872.
7. Молочное хозяйство. — 1903. — № 43.



**В. А. Зенченко**

*Белорусский государственный педагогический университет имени М. Танка, г. Минск*


# ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ИССЛЕДОВАИИЯ ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ГРАЖДАИСКОГО ОБЩЕСТВА В БЕЛАРУСИ

Любая социальная система современного цивилизованного общества, чтобы успещно развиваться, должна опираться на такую основополагающую фундаментальную структуру, как гражданское общество. Поэтому сегодня, когда молодым суверенным государствам, в том числе Республике Беларусь, приходится рещать сложные задачи трансформирующегося общества, важной проблемой является дальнейщее осмысление сущности, истории, условий и путей формирования и развития гражданского общества, представляющего собой основу стабильности государства и политической системы в целом. Формирование развитого гражданского общества не только является важной и необходимой предпосылкой стабильности и эффективности политической системы, но и отражает основные параметры социально-экономическнх и политических преобразований в современной Беларуси. Понятие гражданского общества часто фигурирует в специальной научной литературе. Его исследованием занимаются различные науки, рассматривающие это общество под своим углом зрения: история, политология, социология, юриспруденция. И это неудивительно, ибо гражданское общество представляет собой чрезвычайно сложную и многогранную социальную структуру.

Методологнчески оправдано, на нащ взгляд, начать изучение проблемы формирования граждаиского общества в Беларуси с рассмотрения развития представленнй о гражданском обществе в истории общественной мысли, анализа различных подходов к пониманию его сущности и роли, принципов взаимодействия с государством, определения данной категории.

Как известно, в методологии важное значение имеет четкое и обоснованное определение категориального аппарата анализируемого обьекта. Однако следует отметить, что само понятие гражданского общества еще недостаточно отработано в науке, существуют его различные трактовки, иногда диаметрально противоположные, что, безусловно, затрудняет объективный научный анализ данного феномена.